ф-9

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

ISSN 1993-1999

6
2021



# ЗМЕСТ


## ДЗЯРЖАВА І ПРАВА

**Уладзімір Падалінскі** — **Вальны сойм Рэчы Паспалітай 1572 г.: эпідэмія, улада і грошы** 3

## ПАЛІТЫЧНАЯ ГІСТОРЫЯ

**Аляксандр Горны** — **Рэгіянальныя структуры беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі (1921—1939 гг.)** 14

## ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ

**Анатоль Сініла** — **Партрэты Энгельгартаў з даваеннай калекцыі Беларускага дзяржаўнага музея** 23

**Дзмітрый Ракаў** — **Атрыбуцыя ўніформы і рыштунку армій вайны 1812 г. са збору Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь** 30

## МЕТОДЫКА. ВОПЫТ

**Сергей Герасимович** — **Задания для подготовки учащихся к республиканской олимпиаде по истории** *(IX—XI классы)* 38

**Святлана Тарнаповіч** — **Краязнаўчыя заданні да ўрокаў гісторыі Беларусі ў VII класе** 47

**Наталья Поплавская** — **Беларусь в период Отечественной войны 1812 г.** *(История Беларуси, VIII класс)* 52

## МАТЭРЫЯЛЫ ДА ЎРОКАЎ

**Надежда Кушнер** — **Памятные монеты на уроках обществоведения** 63

**Содержание/Summary** 72


**Старонка "БГЧ" на сайце выдавецтва.**

**Старонка "БГЧ" у Facebook.**

**Аляксандр ГОРНЫ**

# Рэгіянальныя структуры беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі (1921—1939 гг.)



**ГОРНЫ
Аляксандр
Сяргеевіч.**

*Дацэнт кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, дактарант Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1988 г. у Гродна. У 2011 г. закончыў факультэт гісторыі і сацыялогіі, у 2015 г. — аспірантуру Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Абараніў кандыдацкую дысертацыю "Беларускія паланафільскія арганізацыі ў грамадска-палітычным і культурным жыцці Заходняй Беларусі (1921—1937 гг.)". Даследуе гісторыю беларускага нацыянальнага руху ў XX стагоддзі, гісторыю беларускай дыяспары, гісторыю праваслаўнай царквы ў XX стагоддзі. Аўтар каля 70 навуковых і навукова-папулярных публікацый.*

**У міжваеннай Заходняй Беларусі беларускія нацыянальныя структуры былі важнай часткай паўсядзённага жыцця. Розныя арганізацыі імкнуліся пашырыць арэал сваёй дзейнасці, каб ахапіць як мага большую частку беларускага насельніцтва, якое, са свайго боку, шукала ў гэтых ініцыятывах спробу рэалізацыі уласных нацыянальных ці сацыяльных правоў ва ўмовах польскага дзяржаўнага дыскурсу. Пры гэтым заходнебеларуская правінцыя ў адзначаны перыяд стала сапраўдным "полем эксперыментаў", дзе беларускі рух ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі з іншымі нацыянальнымі праектамі спрабаваў забяспечыць сабе моцную базу прыхільнікаў. Рэгіянальныя асаблівасці беларускага руху ў Польшчы 1920—1930-х гг. даюць выдатную магчымасць даследчыкам прааналізаваць узровень нацыянальнай свядомасці тагачасных беларусаў і іх грамадскай актыўнасці, вызначыць лідарскія групы і перыферыю нацыянальнай дзейнасці.**

Беларускі нацыянальны рух у міжваеннай Заходняй Беларусі з'яўляўся цэласнай узаемазалежнай сістэмай, у межах якой існавалі розныя палітычныя плыні са сваімі арганізацыямі і правінцыйнымі структурамі. *Левaрадыкальная плынь* беларускага руху была найбольш масавай і добра арганізаванай, імкнулася змяніць грамадскі і эканамічны лад міжваеннай Заходняй Беларусі рэвалюцыйнымі сродкамі. Да яе адносіліся такія арганізацыі, як Беларуская сялянска-работніцкая грамада (БСРГ), Камуністычная партыя Заходняй Беларусі (КПЗБ), Таварыства беларускай школы (ТБШ), Беларускі сялянска-работніцкі пасольскі клуб "Змаганне" і інш. Да *нацыянальна-дэмакратычнай плыні* можна аднесці арганізацыі, якія не прызнавалі рэвалюцыйных метадаў барацьбы і выступалі за стварэнне незалежнай беларускай дзяржавы. Сярод іх вылучаюцца наступныя: Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД), Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры (БІГіК), Беларускі сялянскі саюз (БСС) і інш. Часовая беларуская рада (ЧБР), таварыства "Прасвета", Беларуская радыкальная народная партыя, Таварыства беларускай асветы прадстаўлялі *паланафільскую плынь* беларускага руху, якая прапагандавала ідэю супрацоўніцтва беларусаў з інстытутамі польскай дзяржавы на розных узроўнях[1]. Кожная з гэтых арганізацый

імкнулася стварыць свае лакальныя структуры ў гарадах і вёсках Заходняй Беларусі.

Сярод шматлікіх публікацый па праблеме дзейнасці беларускіх арганізацый у Заходняй Беларусі на сённяшні час дамінуюць тыя, што закранаюць асобныя інстытуты беларускага руху, напрыклад палітычныя партыі, культурна-асветніцкія таварыствы і інш. Разам з тым тэарэтычны ўзровень вывучэння гэтых структур, які патрабуе грунтоўнага параўнальнага аналізу і комплекснага падыходу, не стаў прыярытэтам для сучасных даследаванняў у Беларусі. Рэгіяналістыка беларускага руху дае падставы закрануць тэарэтычныя аспекты гэтай праблемы і вызначыць абагульняючыя накірункі даследавання гісторыі міжваеннага перыяду. Таму для больш аптымальнага аналізу мы прапаноўваем разглядаць рэгіянальныя асаблівасці дзейнасці беларускіх структур у Заходняй Беларусі праз прызму адмысловых ярусаў, якія маюць комплексныя характарыстыкі. Дадзеныя ярусы распрацаваныя з улікам ступені развіцця беларускага руху на ўзроўні горад/вёска і адлюстроўваюць вертыкальную схему пашырэння беларускай актыўнасці ў міжваеннай Заходняй Беларусі:

**1) Лідарскі ярус** — вышэйшы ярус развіцця беларускага руху, звязаны з дзейнасцю лідараў і кіруючых структур. У большасці сваёй ён ахопліваў Вільню, дзе ў міжваенны перыяд знаходзіліся цэнтральныя органы практычна ўсіх беларускіх партый і арганізацый, жылі і дзейнічалі лідары беларускага руху ўсіх палітычных плыняў, знаходзіліся рэдакцыі многіх беларускіх газет і часопісаў. Менавіта з гэтага горада зыходзілі пэўныя дырэктыўныя ўстаноўкі аб фарміраванні і развіцці правінцыйных беларускіх структур, а кіраўнікамі арганізацый выпрацоўвалася агульная стратэгія дзейнасці ў заходнебеларускіх ваяводствах. Разам з гэтым частка лідараў і аўтарытэтных беларускіх дзеячаў пражывалі па-за межамі Вільні, напрыклад выдавец А.Уласаў, дэпутат польскага сейма ад беларускай меншасці В.Рагуля і інш.

**2) Гарадскі ярус** — ахопліваў тыя гарады Заходняй Беларусі, дзе існавалі і дзейнічалі розныя беларускія арганізацыі і ініцыятывы. У гэтым ярусе неабходна вылучыць наступныя катэгорыі: а) гарадскія лакальныя цэнтры беларускага руху; б) іншыя гарады з беларускімі асяродкамі. У першай катэгорыі беларускі рух дасягаў дастаткова значнай канцэнтрацыі ў гарадскім асяроддзі і выходзіў за рамкі замкнёнага беларускага асяродка ўнутры гарадской супольнасці. Звычайна ў гарадскіх лакальных цэнтрах беларускі рух меў значны рэсурс для сваёй агітацыі ў выглядзе прэсы, ствараў добра арганізаваныя адукацыйныя ініцыятывы, уплываў на органы мясцовага самакіравання і на правінцыйныя структуры ў той ці іншай мясцовасці. Паводле ступені развіцця беларускай актыўнасці мы вызначылі тры гарадскія лакальныя цэнтры беларускага руху ў Заходняй Беларусі: Гродна, Навагрудак і Баранавічы. Ва ўсіх астатніх заходнебеларускіх гарадах беларуская актыўнасць дасягала розных узроўняў, аднак не мела такой канцэнтрацыі, як у вышэйназваных гарадах.

**3) Сельскі правінцыйны ярус** — гэта асяродкі беларускага руху, якія дзейнічалі ў сельскай мясцовасці ў заходнебеларускіх паветах і належалі розным палітычным і грамадскім структурам. Дадзены ярус ахоплівае вясковыя і местачковыя ячэйкі розных беларускіх арганізацый, у склад якіх уваходзілі пераважна сяляне і прадстаўнікі вясковай інтэлігенцыі. Таксама да гэтага яруса належыць цэлы арэал актывістаў і прыхільнікаў беларускага руху — жыхароў вёсак, якія выпісвалі беларускія газеты, распаўсюджвалі беларускую літаратуру і лістоўкі, арганізоўвалі беларускія школы і кааператывы. Гэты ярус быў найбольш шматлікім і ахопліваў дзясяткі тысяч людзей.

Каб адлюстраваць комплексна праблему дзейнасці розных ярусаў беларускага руху і ўлічыць максімальную пашыранасць рэгіянальных беларускіх структур, для дадзенага артыкула былі складзены адмысловыя табліцы па чатырох ваяводствах міжваеннай Польшчы, у склад якіх уваходзілі беларускія землі. У табліцах паказана колькасць рэгіянальных гурткоў беларускіх палітычных і культурна-асветніцкіх арганізацый розных ідэалагічных плыняў. Не закранаюцца лакальныя структуры БХД, бо паводле камуніката кіраўніцтва з 1927 г. гэтая партыя перастала арганізоўваць мясцовыя гурткі і займалася толькі рэгістрацыяй асобных сябраў[2]. Тым не менш колькасць прыхільнікаў нацыянальна-дэмакратычнай плыні ў пэўнай ступені адлюстроўваюць гурткі БІГіК, у рамках якіх працавалі сябры як БХД, так і БСС. Храналагічна большасць прыведзеных дадзеных у табліцах характарызуюць перыяд з 1925 па 1932 г., які можна ўмоўна назваць пікам беларускай арганізаванай актыўнасці ў міжваеннай Польшчы. Мы закранулі толькі арганізацыйныя формы дзейнасці беларускага нацыянальнага руху, якія паводле статутаў мелі права ствараць свае лакальныя структуры. Беларускае школьніцтва, кааператывы, кнігарні і іншыя праявы беларускай актыўнасці складаюць асобны велізарны аспект даследавання, які пры далейшым комплексным асэнсаванні неабходна арганічна спалучыць з арганізацыйна-партыйнымі структурамі, што разгледжаны ў гэтым артыкуле.

Цяжкасць на сённяшні час уяўляе вызначэнне рэгіянальных структур адной з вядомых беларускіх левардыкальных арганізацый у Заходняй Беларусі — КПЗБ. Ва ўнутраным справаводстве актывісты гэтай партыі карысталіся ўласным адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам, напрыклад, верхняй тэрытарыяльнай адзінкай КПЗБ лічылася акруга на чале з акружным камітэтам, у склад якой маглі уваходзіць паветы з розных ваяводстваў. Больш за тое, пастаянныя праследаванні мясцовых структур партыі з боку паліцыі не давалі магчымасці партыйнаму кіраўніцтву вызначаць хаця б прыблізную колькасць ячэек, якія

маглі ўзнікаць хаатычна, а пасля быць разгромленымі ўладамі. Таму статыстыка КПЗБ фіксавала пераважна колькасць сябраў партыі ў розных рэгіёнах Заходняй Беларусі. У табліцы 1 прадстаўленая колькасць актыву КПЗБ па 11 акругах, якая была вызначана адным з сябраў ЦК арганізацыі ў 1933 г. Гэтая дата была ўзятая намі менавіта з той прычыны, што ў гэты час КПЗБ дасягнула максімальнай колькасці сваіх акруговых камітэтаў за ўвесь перыяд дзейнасці. Ніжэй дадзеныя з гэтай табліцы будуць дапасаваныя пры аналізе іншых рэгіянальных структур беларускага руху ў заходнебеларускіх ваяводствах міжваеннай Польшчы.

*Табліца 1*

**Колькасны стан актыву КПЗБ па розных партыйных акругах на ліпень 1933 г.**[3]

| Акруга КПЗБ | Колькасць сябраў |
|---|---|
| Віленская | 20 |
| Маладзечанская | 136 |
| Браслаўская | 77 |
| Глыбоцкая | 200 |
| Навагрудская | 475 |
| Слонімская | 263 |
| Гродзенская | 396 |
| Беластоцкая | 533 |
| Ваўкавыская | 43 |
| Брэсцкая | 237 |
| Пінская | 291 |
| Агулам | 2671 |

Рознабаковым беларускае палітычнае і культурна-асветніцкае жыццё выглядала на тэрыторыі **Віленскага ваяводства**. У паветах, значную долю жыхароў якіх складала каталіцкае насельніцтва (Ашмянскі, Браслаўскі, Віленска-Троцкі і інш.), былі вельмі папулярныя арганізацыі хрысціянска-дэмакратычнай нацыянальнай арыентацыі — БХД, БІГіК і БСС, што пацвярджаюць дадзеныя табліцы 2. Фактычна менавіта гэтыя рэгіёны беларускія хрысціянскія дэмакраты лічылі "сваімі", што стварала неспрыяльную сітуацыю для дзейнасці, напрыклад, ТБШ, якое прайгравала ў канкурэнцыі і мела ў гэтых паветах невялікую колькасць сваіх гурткоў. Паказальна, што толькі ў Браславе ў свой час існаваў адзіны павятовы камітэт БСС — нацыянальна-дэмакратычнай арганізацыі, якая так і не ўтварыла на ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі сваёй разгалінаванай структуры[4]. Акрамя пералічаных арганізацый у ваяводстве можна было заўважыць і некалькі лакальных структур культурна-асветніцкага таварыства "Беларускі гаспадарчы звяз" пад кіраўніцтвам Я.Станкевіча. Пры гэтым у "каталіцкім" Свянцянскім павеце беларускі рух сутыкаўся з добра арганізаваным літоўскім актывізмам, што прадвызначыла мізэрнасць беларускіх структур на гэтых тэрыторыях.

"Палявенне" беларускага руху ў Віленскім ваяводстве адбывалася далей ад ваяводскага цэнтра, у паветах, дзе вялікую долю жыхароў складала праваслаўнае насельніцтва (Вілейскі, Дзісенскі, Маладзечанскі). Як вынікае з табліцы 2, менавіта ў іх у сельскім правінцыйным ярусе беларускага руху дамінавалі структуры левадыкальных арганізацый — БСРГ і ТБШ. Нацыянальна-дэмакратычныя беларускія арганізацыі спрабавалі пашырыць тут свае ўплывы, але значна саступалі пазіцыі. Узровень падтрымкі левадыкальных структур на дадзеных тэрыторыях быў вельмі высокі. Напрыклад, вілейскі павятовы камітэт БСРГ, паводле назіранняў польскай паліцыі, успрымаўся насельніцтвам як прататып будучых органаў улады[5].

Падобная сітуацыя была характэрная і для структур КПЗБ у Віленскім ваяводстве, якія таксама пашыраліся далей ад цэнтра, і пераважна на паветы з праваслаўным насельніцтвам. Згодна з табліцай 1, у віленскай акрузе КПЗБ на 1933 г. налічвалася ўсяго 20 сябраў партыі, якія фактычна ўваходзілі ў партыйныя ячэйкі ў самім ваяводскім цэнтры. Такая малалікасць магла тлумачыцца ў першую чаргу няздольнасцю ў актывістаў КПЗБ вытрымаць канкурэнцыю з левадыкальнымі польскімі і яўрэйскімі структурамі ў Вільні, якія мелі сваю багатую палітычную традыцыю ў горадзе. Яшчэ ў 1920-я гг. партыйнае кіраўніцтва крытыкавала віленскі акружны камітэт КПЗБ за слабасць і бяздзейнасць[6].

У Віленскім ваяводстве ў міжваенны перыяд таксама можна было заўважыць структуры беларускіх паланафільскіх арганізацый. У гэтым плане вылучаўся Маладзечанскі павет, дзе быў утвораны сакратарыят ЧБР і шэраг гурткоў "Прасветы". Размяшчэнне гэтых структур тлумачылася значнай агітацыйнай дзейнасцю, якую праводзіў у згаданым павеце адзін з лідараў ЧБР Т.Вернікоўскі[7]. Астатнія паланафільскія арганізацыі, як, напрыклад, Таварыства беларускай асветы ці Беларуская радыкальная народная партыя, мелі на тэрыторыі ваяводства кропкавыя прадстаўніцтвы.

У цэлым кожны павет Віленскага ваяводства быў ахоплены структурамі беларускага нацыянальнага руху на розных ярусах. Важнай дамінантай быў горад Вільня як месца канцэнтрацыі лідарскіх структур беларускіх арганізацый. У іншых гарадах ваяводства так і не склалася моцных лакальных цэнтраў беларускай актыўнасці, аднак у некаторых гарадах (Глыбокае, Вілейка, Маладзечна) прысутнічалі арганізаваныя беларускія асяродкі. Пераважная большасць структур беларускага руху, пазначаных у табліцы 2, знаходзілася ў сельскай мясцовасці.

У **Навагрудскім ваяводстве** беларускі нацыянальны рух дасягнуў адной з лепшых пазіцый і таксама ахапіў сваім уплывам усе паветы. Гэтае ваяводства мела пэўныя асаблівасці: было памежным з тэры-

*Табліца 2*

**Структуры беларускага нацыянальнага руху ў Віленскім ваяводстве ў 1921—1939 гг.[8]**

| Арганізацыі / Паветы | БСРГ[9] | БІГіК, БСС, БХД | ТБШ[10] | Прасвета | ЧБР | Беларускі пасольскі клуб | БСРПК "Змаганне" | Іншыя | Разам |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Ашмянскі | 5 | 10 | | | | | 1 | 4[11] | 20 |
| Браслаўскі | 51 | 12 | 5 | | | | | | 68 |
| Вілейскі | 53 | 7 | 23 | 3 | | 1 | 1 | 1[12] | 89 |
| Віленска-Троцкі | 1 | 14 | 3 | | 1 | 1 | 1 | 1[13] | 22 |
| Дзісенскі | 138 | 3 | 11 | | | 1 | 1 | 1[14] | 155 |
| Маладзечанскі | 115 | 6 | 20 | 15 | 1 | | 1 | 2[15] | 160 |
| Пастаўскі | 110 | 2 | 15 | | | | 1 | | 128 |
| Свянцянскі | 1 | 5 | | | | | | | 6 |

торыяй БССР і з'яўлялася самай малаўрбанізаванай часткай міжваеннай Польшчы[16]. Да таго ж па землях ваяводства ў свой час праходзіў фронт Першай сусветнай вайны, што, безумоўна, наклала адбітак на эканамічнае і сацыяльнае становішча вясковага насельніцтва. Польскія ўлады, якія абкладалі сялянскія гаспадаркі высокімі падаткамі, а таксама пашыралі польскую сістэму адукацыі і асадніцтва, вельмі адмоўна ўспрымаліся мясцовым беларускім насельніцтвам. У справаздачах польскіх чыноўнікаў з Навагрудскага ваяводства, асабліва ў 1920-я гг., пастаянна падкрэсліваліся негатыўныя, нават варожыя адносіны беларусаў да уладаў. Польская ўлада ўспрымалася беларускім насельніцтвам як часовая, а сярод сялян былі распаўсюджаныя чуткі аб хуткім пачатку Польска-савецкай вайны і паўстанні супраць Польшчы[17]. Дадзеныя акалічнасці стваралі спрыяльную глебу для развіцця на тэрыторыі ваяводства беларускага руху.

У ваяводстве існавалі два гарадскія лакальныя цэнтры беларускага руху — Баранавічы і Навагрудак. Менавіта ў гэтых гарадах беларускія актывісты мелі доступ да гарадскога самакіравання, арганізоўвалі адукацыйныя і асветніцкія праекты, выдавалі газеты і часопісы, пашыралі беларускасць на правінцыйныя асяродкі[18]. У сельскай мясцовасці і мястэчках ваяводства беларускі рух меў шырокае прадстаўніцтва, што адлюстравана ў табліцы 3. Нягледзячы на памылковую заўвагу польскага гісторыка Я.Ягуся, што беларусы ў міжваеннай Польшчы стварылі невялікую колькасць уласных партый і арганізацый, прыведзеныя намі дадзеныя адлюстроўваюць зусім іншы факт: у Наваградскім ваяводстве быў прадстаўлены дастаткова шырокі спектр інстытутаў беларускага руху, а ў некаторых мясцовасцях узнікалі ініцыятывы, якія не мелі аналагаў у іншых заходнебеларускіх ваяводствах[19].

Вялікімі ў ваяводстве былі структуры беларускіх левардыкальных арганізацый. Традыцыйна яны мелі моцныя пазіцыі ў Баранавіцкім, Стаўбцоўскім, Слонімскім і Наваградскім паветах, дзе існавалі акруговыя камітэты КПЗБ, БСРГ ці ТБШ[20]. У некаторых раёнах тагачаснай Навагрудчыны, паводле інфармацыі польскіх чыноўнікаў, гурткі гэтых арганізацый лічыліся сялянамі правобразам будучых мясцовых беларускіх уладаў. Папулярнасць левардыкальных арганізацый у гэтым рэгіёне была прадэманстраваная, у прыватнасці, пад час выбараў у польскі парламент у 1928 г., калі па Навагрудскай акрузе за пострамадаўскі спіс "Змагання за інтарэсы работнікаў і сялян" прагаласавала больш за 70 000 выбаршчыкаў[21].

Пашырэнне структур нацыянальна-дэмакратычных арганізацый (БІГіК і БСС) у асноўным было звязана з дзейнасцю ў Навагрудскім і Баранавіцкім паветах беларускага дэпутата сейма В.Рагулі — аднаго з лідараў БСС і ўраджэнца Навагрудскага павету[22]. Актыўнасцю ў ваяводстве вылучаліся і беларускія паланафільскія арганізацыі. Прыхільнікі ЧБР і "Прасветы" стваралі свае сакратарыяты і гурткі ў асноўным у Баранавіцкім, Нясвіжскім і Валожынскім паветах — месцах актыўнай дзейнасці лідараў беларускіх паланафілаў А.Паўлюкевіча, А.Кабычкіна і Н.Кернажыцкага. Невыпадкова, што менавіта на гэтых тэрыторыях пасля Польска-савецкай вайны аказалася значная колькасць удзельнікаў антысавецкіх партызанскіх атрадаў, якія маглі прыхільна ставіцца да антыкамуністычнай паланафільскай ідэалогіі[23]. Агульную палітру беларускай актыўнасці ў ваяводстве дапаўнялі лакальныя ініцыятывы ў выглядзе Беларускага дабрачыннага таварыства ў Стаўбцах ці маргінальныя паланафальскія арганізацыі кшталту Цэнтральнага камітэта па беларускіх справах у Баранавічах.

*Табліца 3*

**Структуры беларускага нацыянальнага руху ў Навагрудскім ваяводстве ў 1921—1939 гг.[24]**

| Арганізацыі / Паветы | БСРГ | БІГіК | ТБШ | Прасвета | ЧБР | Беларускі пасольскі клуб | БСРПК "Змаганне" | Іншыя | Разам |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Баранавіцкі | 48 | 11 | 7 | 1 | 1 | 1 | 1 | 2[25] | 72 |
| Валожынскі | 39 | 1 | 6 | 8 | 1 | | 1 | 10[26] | 66 |
| Лідскі | 49 | 4 | 16 | 2 | 1 | 1 | 1 | 1[27] | 75 |
| Навагрудскі | 184 | 5 | 51 | 2 | 1 | 1 | 1 | 2[28] | 247 |
| Нясвіжскі | 22 | 7 | 5 | 10 | 3 | 1 | | | 48 |
| Слонімскі | 137 | 1 | 36 | 3 | | | 1 | | 178 |
| Стаўбцоўскі | 63 | 3 | 31 | | | 1 | | 1[29] | 99 |

**Беластоцкае ваяводства** міжваеннай Польшчы можна ўмоўна падзяліць на "польскую" і "беларускую" часткі. Структуры беларускага руху ўтвараліся пераважна ў яго ўсходніх паветах, што ў пэўнай ступені адпавядала польска-беларускай этнічнай мяжы, акрэсленай этнолагамі ў пачатку XX ст. На тэрыторыі ваяводства існаваў значны гарадскі лакальны цэнтр беларускага руху — Гродна, які, з аднаго боку, меў сталыя кантакты з віленскім цэнтрам, а з другога — аказваў кіраўнічы ўплыў на многія правінцыйныя структуры руху. У міжваенны перыяд у горадзе існавалі Беларускае дабрачыннае таварыства, беларускі прытулак, беларуская сямігадовая школа, якая была зачынена толькі ў 1928 г. і з'яўлялася адной з узорных беларускіх пачатковых школ у міжваеннай Польшчы. З лютага 1923 г. у горадзе дзейнічаў сакратарыят БПК, існавалі таксама структуры БІГіК, ТБШ, БСРГ, КПЗБ. У розныя гады ў міжваенны перыяд у Гродна выдаваліся газеты "Беларускі шлях", "Сялянская гутарка", "Беларуская доля", "Беларуская думка" і некалькі аднаднёвак[30]. Акрамя гэтага, пэўны асяродак беларускага руху прысутнічаў у Беластоку. Тут на мяжы 1920—1930-х гг. дастаткова паспяхова дзейнічаў мясцовы гурток і акружная ўправа ТБШ, а ў 1930-я гг. беларускі рух захоўваўся ў рамках дзейнасці выдавецкіх і тэатральных кааператываў "Рунь", "Сяўба" і "Полымя"[31].

Правінцыйныя структуры беларускага руху ў Беластоцкім ваяводстве вылучаліся неаднароднасцю ў ідэалагічным плане. Як бачна з табліц 1 і 4, у гэтым рэгіёне былі прадстаўленыя ўсе плыні беларускага нацыянальнага руху: левaрадыкальная, нацыянальна-дэмакратычная і ў нязначнай ступені паланафільская. Прадстаўнікі апошняй дзейнічалі толькі ў Гродне і ваколіцах, не стварыўшы значных правінцыйных гурткоў сваіх арганізацый. З нацыянальна-дэмакратычных арганізацый былі ў асноўным, гурткі БІГіК. Дадзеныя структуры дзейнічалі, між іншым, у паветах са значнай доляй праваслаўных жыхароў (напрыклад, Бельскі ці Ваўкавыскі паветы), што сведчыць аб падтрымцы хрысціянска-дэмакратычных ідэй не толькі ў асяроддзі каталіцкага насельніцтва[32]. Гурткі БІГіК выступалі значным фактарам пашырэння нацыянальнай свядомасці беларусаў, якія фактычна жылі ў адносн͏ай аддаленасці ад асноўных ачагоў беларускай актыўнасці. У прыватнасці, у гуртку БІГіК у в. Нараўка Бельскага павета існавала вялікая бібліятэка беларускіх выданняў, якой карысталіся каля 30 мясцовых жыхароў, хоць у гуртку афіцыйна лічылася 16 сябраў[33].

Беластоцкае ваяводства не было выключэннем у дзейнасці левaрадыкальнага беларускага руху, які, па некаторых паказчыках, лідыраваў тут адносна іншых ваяводстваў міжваеннай Польшчы. КПЗБ дзейнічала ў ваяводстве з пачатку свайго існавання, а найбольш арганізаваныя структуры партыі былі ў Беластоку, Гродне, Скідзелі, Індуры, Вялікай Бераставіцы, Крынках і іх ваколіцах. Як бачна з табліцы 1, у межах Беластоцкага ваяводства на 1933 г. дзейнічала тры акружныя камітэты КПЗБ (Гродзенскі, Беластоцкі, Ваўкавыскі), якія аб'ядноўвалі больш за 900 актывістаў, альбо 36,4% ад усяго актыву КПЗБ у Заходняй Беларусі. Нездарма, па прызнанні кіраўніцтва партыі, у 1930-я гг. беластоцкі акружны камітэт КПЗБ лічыўся адным з лепшых па ўзроўні арганізаванасці і практычнай дзейнасці[34]. У 1926 г. у Гродзенскім павеце Беластоцкага ваяводства была зафіксавана найбольшая колькасць гурткоў БСРГ сярод усіх паветаў Заходняй Беларусі[35]. Таксама сваёй колькасцю на Гродзеншчыне вылучаліся структуры ТБШ, у прыватнасці скідзельскі і свіслацкі гурткі, якія мелі моцны ўплыў на насельніцтва і праводзілі добра арганізаваную асветніцкую дзейнасць. На нашу думку, папулярнасць КПЗБ, БСРГ і ТБШ на гэтых тэрыторыях была звязаная з некалькімі фактарамі: існаваннем тут пад час германскай акупацыі перыяду Першай сусветнай вайны разгалінаванай сеткі беларускага школьніцтва, моцнымі ўплывамі прыхільнікаў партыі беларускіх эсэраў, актыўнай дзейнасцю ў 1919—1921 гг. структур Гродзенскай павятовай сялянскай рады і Грамады беларускай моладзі. Беларускі нацыянальны рух, у цэлым на гэтых землях меў значную традыцыю існавання яшчэ з пачатку XX ст.[36].

*Табліца 4*

**Структуры беларускага нацыянальнага руху ў Беластоцкім ваяводстве ў 1921—1939 гг.**[37]

| Арганізацыі / Паветы[38] | БСРГ | БІГіК, БСС, БХД | ТБШ | Прасвета | ЧБР | Беларускі пасольскі клуб | БСРПК "Змаганне" | Іншыя | Разам |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Аўгустоўскі | | 1 | | | | | | | 1 |
| Беластоцкі | 29 | 3 | 13 | | | | 1 | | 46 |
| Бельскі | 26 | 3 | 6 | | | 2 | 1 | | 38 |
| Сакольскі | 17 | | 4 | | | 1 | | | 22 |
| Гродзенскі | 198 | 1 | 48 | 3 | 1 | 2 | 1 | 5[39] | 259 |
| Ваўкавыскі | 93 | 4 | 10 | | | 1 | 1 | | 109 |

Складанасцю этнічных працэсаў у міжваеннае дваццацігоддзе вылучалася **Палескае ваяводства**. Палессе было своеасаблівым геаграфічным памежжам трох нацыятворчых праектаў — беларускага, украінскага і польскага, што значна ўплывала на палітычныя і культурныя працэсы ў гэтым рэгіёне. У прыватнасці, некаторыя замежныя даследчыкі лічаць гэтую адміністрацыйную адзінку міжваеннай Польшчы найменш ахопленай беларускімі нацыянальнымі структурамі на тэрыторыі т. зв. "крэсаў усходніх". Такая ацэнка тлумачылася таксама і тым, што ў разглядаемы перыяд польскія ўлады праводзілі тут адмысловую палітыку ўзмацнення рэгіянальнай ідэнтычнасці "палешукоў" і далейшай іх асіміляцыі польскім этнасам, таму рабіліся актыўныя захады, каб не дапусціць сюды беларускі рух з Віленшчыны ці Навагрудчыны[40]. Дадзенае тлумачэнне шмат у чым справядлівае, калі ўлічыць, напрыклад, выкарыстанне польскімі ўладамі канцэпту "тутэйшыя" для вызначэння мясцовага насельніцтва са слабай нацыянальнай ідэнтычнасцю, якое найбольш прыдатнае для паланізацыі[41]. Тым не менш, нягледзячы на перашкоды з боку ўладаў, беларускі рух у Палескім ваяводстве стварыў свае правінцыйныя структуры, якія не былі маламалікімі, аднак мелі пэўныя асаблівасці геаграфічнага размяшчэння і ідэалагічнай прыналежнасці.

Пасля Польска-савецкай вайны ў ваяводстве беларускія нацыянальныя структуры пачалі з'яўляцца пад час выбарчай кампаніі ў польскі парламент 1922 г. У палескія вёскі прыходзілі беларускія актывісты, з'яўляліся ўлёткі і перыядычныя выданні, з дапамогай якіх ажыццяўлялася агітацыя ў нацыянальным духу. Напрыклад, у верасні 1922 г. у Лунінцы быў створаны Беларускі павятовы выбарчы камітэт, куды ўваходзілі прадстаўнікі мясцовай інтэлігенцыі[42]. Сустракаюцца сведчанні, што ў 1923 г. быў створаны сакратарыят БПК у Пружанах[43]. Але беларуская агітацыя ў Палескім ваяводстве ў большай ступені, чым у іншых заходнебеларускіх ваяводствах, праводзілася пераважна сярод сялян. За міжваеннае дваццацігоддзе ў гэтым рэгіёне так і не было створана гарадскога лакальнага цэнтра беларускага руху. Тым не менш значны беларускі асяродак на мяжы 1920—1930-х гг. існаваў у Пінску. У горадзе дзейнічалі павятовы камітэт БСРГ, гурток ТБШ, павятовы сакратарыят БСРПК "Змаганне", філіял Беларускага кааператыўнага банка. Прадстаўнікі віленскага яруса беларускага руху разглядалі гэты горад як своеасаблівы фарпост беларускасці на Палессі, куды неабходна было накіроўваць усе магчымыя інфармацыйныя патокі дзеля далейшай беларускай агітацыі[44]. У прыватнасці, паводле віленскага кіраўніцтва БСРПК "Змаганне" яго пінскі павятовы сакратарыят мусіў распаўсюджваць свае ўплывы не толькі на Пінскі, але і на Столінскі, Лунінецкі, Драгічынскі і Брэсцкі паветы[45]. Аднак наяўнасць у Пінску дастаткова арганізаванага і актыўнага асяродка прадстаўнікоў рускай меншасці і рускай эміграцыі, а таксама дзейнасць польскіх і яўрэйскіх сацыялістычных арганізацый, не дазволілі беларускім актывістам распачаць выпуск перыядычных выданняў ці мець прадстаўніцтва ў органах гарадскога самакіравання[46]. У сталіцы Палескага ваяводства — Брэсце — на працягу міжваеннага дваццацігоддзя практычна не было створана беларускіх структур, калі не лічыць гарадскія ячэйкі КПЗБ і сакратарыят БСРПК "Змаганне", сябрамі якіх у асноўным з'яўляліся актывісты яўрэйскага паходжання[47].

Як падкрэслівалася вышэй, у Палескім ваяводстве беларускі рух быў пашыраны пераважна сярод жыхароў вёсак ці мястэчак, што ў значнай ступені абумовіла яго палітычную накіраванасць. Значная колькасць сялян, якія чакалі аграрных пераўтварэнняў і знаходзіліся пасля Першай сусветнай вайны ў цяжкіх матэрыяльных умовах, былі выдатнай мэтавай аўдыторыяй для левых ідэй. Больш за тое, трэба ўлічваць тагачасную нізкую сацыяльную камунікацыю ў рэгіёне, абумоўленную геаграфічнай асаблівасцю Палесся, што спрыяла дамінаванню нейкай адной ідэі ў палітычным дыскурсе і адсутнасці ідэалагічнай канкурэнцыі. Можна сцвярджаць, што Палескае ваяводства сярод чатырох заходнебеларускіх ваяводстваў Польшчы было найбольш "левардыкальным" у палітычным плане, а беларускі рух тут меў пераважна лявацкае адценне. У табліцы 5 адлюстравана знач-

*Табліца 5*

**Структуры беларускага нацыянальнага руху ў Палескім ваяводстве ў 1921—1939 гг.**[55]

| Арганізацыі / Паветы[56] | БСРГ | БІГіК | ТБШ | Прасвета | ЧБР | Беларускі пасольскі клуб | БСРПК "Змаганне" | Іншыя | Разам |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Брэсцкі | 5 | | 1 | | | | 1 | | 7 |
| Драгічынскі | | | | | | | | | |
| Кобрынскі | | | | | | | | | |
| Косаўскі | 97 | 1 | 57 | | | | 1 | | 156 |
| Лунінецкі | 12 | | 1 | | | | | | 13 |
| Пінскі | 18 | | 4 | | | | 1 | | 23 |
| Пружанскі | 62 | 3 | 13 | | | 1 | | | 79 |
| Столінскі | 1 | | | | | | | | 1 |

ная дамінанта ў ваяводстве беларускіх арганізацый левардыкальнай плыні. Мізэрную колькасць на гэтым фоне складалі структуры нацыянальна-дэмакратычнай арыентацыі, а менавіта гурткі БІГіК, якія існавалі ў паўночнай частцы ваяводства. Структуры беларускіх паланафільскіх арганізацый на Палессі ўвогуле не існавалі на працягу міжваеннага перыяду, хаця беларуская праўрадавая прэса распаўсюджвалася ў некаторых паветах Палескага ваяводства[48].

Лакалізацыя беларускага нацыянальнага руху ў Палескім ваяводстве таксама мела свае асаблівасці ў міжваенны перыяд. Прысутнасць беларускіх нацыянальных арганізацый дастаткова моцна адчувалася ў Пружанскім, Косаўскім, Пінскім паветах, менш — у Лунінецкім і Столінскім, і фактычна была нязначнай у Брэсцкім, Кобрынскім, Драгічынскім паветах. Даследчыкі спрабуюць растлумачыць гэтую асаблівасць некалькімі прычынамі. У прыватнасці, Э.Мазько падкрэсліваў нізкі ўзровень беларускай нацыянальнай свядомасці палешукоў, што звужала магчымасці праўдзення беларускай агітацыі ў рэгіёне[49]. У сваю чаргу, А.Пашкевіч звяртаў увагу на актыўнасць у Палескім ваяводстве украінскіх нацыянальных арганізацый, якія мелі дастаткова разгалінаваную структуру, прынамсі, у Брэсцкім, Кобрынскім ці Драгічынскім паветах[50]. Аднак, на нашу думку, падобная дыферэнцыяцыя была абумоўленая не столькі этнічнымі ці міжэтнічнымі фактарамі, колькі цалкам нераспрацаванай стратэгіяй дзейнасці ў гэтым рэгіёне з боку віленскага яруса беларускага нацыянальнага руху. Сярод тагачасных беларускіх лідараў у Вільні фактычна не было ўраджэнцаў Палесся, якія мелі б грунтоўнае ўяўленне аб асаблівасцях агітацыі на гэтых тэрыторыях. Адзінымі віленскімі дзеячамі, якія больш-менш ведалі палескі рэгіён, былі Р.Астроўскі (жыў у свой час у Пружанах, Пінску і Брэсце) і Р.Шырма (нарадзіўся ў Пружанскім павеце). Верагодна, дзякуючы Шырме і шматлікім вучням з Віленскай беларускай гімназіі, Пружанскага і Косаўскага паветаў, гэтыя паветы ў 1920-х гг. былі ахопленыя беларускімі структурамі, і ў першую чаргу гурткамі ТБШ. Іх сувязь з віленскім цэнтрам яскрава выявілася пад час кампаніі па зборы дэкларацый аб адкрыцці беларускіх школ у 1925 г., калі агулам у гэтых паветах было пададзена больш за 3000 дэкларацый[51]. Аднак, Пінск, як ужо падкрэслівалася вышэй, разглядаўся віленскімі дзеячамі як моцная гарадская кропка па распаўсюджванні беларускасці на бліжэйшыя мясцовасці, у тым ліку ўласна Пінскі, Лунінецкі і Столінскі паветы. Усе астатнія раёны на Палессі наўпрост "ігнараваліся" лідарамі беларускага руху ў Вільні. Беларускія ініцыятывы, якія там маглі ўзнікнуць "знізу", не знаходзілі ўвагі цэнтра і хутка згасалі альбо далучаліся да дзейнасці левардыкальнай КПЗБ. Як адзначала К.Разуванава, адной з прычын слабасці БІГіК у Палескім ваяводстве была адсутнасць сталых сувязяў і дапамогі ад віленскага кіраўніцтва[52].

У развіцці структур беларускага руху ў Палескім ваяводстве нельга недаацэньваць ролю КПЗБ. Нягледзячы на дамінаванне ў дзейнасці партыі сацыяльнай рыторыкі, у ёй прысутнічаў і значны беларускі кампанент, што дазваляе разглядаць гэтую арганізацыю як частку беларускага нацыянальнага руху. Як бачна з табліцы 1, у Палескім ваяводстве дзейнічалі брэсцкі і пінскі акружныя камітэты партыі, у рамках якіх працавала немалая колькасць актывістаў. Сярод іншага яны выкарыстоўвалі лозунгі, звязаныя з патрабаваннем уз'яднання палескіх паветаў з Савецкай Беларуссю, што давала магчымасць мясцоваму насельніцтву разумець тэрыторыю свайго пражывання як частку этнічнай беларускай тэрыторыі. У прыватнасці, у 1925 г. рабочыя Брэста разам з агітатарамі КПЗБ у ходзе гарадскога мітынгу скандавалі: *"Няхай жыве аб'яднаная Савецкая Беларусь!"*[53]. Больш за тое, КПЗБ распаўсюджвала ў палескіх вёсках беларускамоўныя газеты і літаратуру, агітавала за адкрыццё беларускіх школ, што стварала значную канкурэнцыю для ўкраінскай актыўнасці ў гэтым рэгіёне і фар-

міравала аснову для распаўсюджвання беларускай самасвядомасці[54].

Неабходна адзначыць, што беларускі нацыянальна-вызваленчы рух у міжваенны перыяд развіваўся ў Заходняй Беларусі нераўнамерна, але паспяхова пранікаў у розныя рэгіянальныя асяродкі, не звужаючы арэал сваёй дзейнасці. Беларускую актыўнасць можна было заўважыць амаль ва ўсіх паветах тагачаснай Заходняй Беларусі. Разнастайнасцю ідэалагічных кірункаў, форм працы і шматлікай колькасцю лакальных структур вылучалася дзейнасць беларускіх арганізацый у Навагрудскім ваяводстве, значнымі былі ўплывы беларускага руху ў Віленскім і Беластоцкім ваяводствах. Палескае ваяводства было перэферыяй беларускай актыўнасці, дзе, аднак, яна з'яўлялася неад'емнай часткай мясцовага грамадскага дыскурсу ў выглядзе дзейнасці КПЗБ і іншых левcéрадыкальных структур. Пры гэтым слабасць беларускага руху на Палессі была шмат у чым выкліканая аддаленасцю ад віленскага цэнтра, што стрымлівала вертыкальныя кантакты мясцовых беларускіх эліт. Разам з тым наяўнасць значных гарадскіх лакальных цэнтраў у Беластоцкім (Гродна) і Навагрудскім (Баранавічы, Навагрудак) ваяводствах стварала на гэтых тэрыторыях моцныя базы для пранікнення ў вясковае асяроддзе. Такім чынам, беларускі рух у Заходняй Беларусі можна разглядаць як цэласную сістэму з вертыкальнымі сувязямі ад лідарскага цэнтра да правінцыйных структур, якую стваралі тысячы мясцовых актывістаў.

Аналіз рэгіянальных структур беларускага руху ў Заходняй Беларусі дазваляе закрануць яшчэ адно важнае пытанне: ці быў гэты рух масавым? У свой час чэшскі гісторык Міраслаў Грох пры вывучэнні нацыянальных рухаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы падкрэсліў, што ў беларускім нацыяналізме працэс пераходу ад патрыятычнай агітацыі да масавага руху быў вельмі замаруджаны і фактычна адбыўся штучным шляхам у часы савецкай "беларусізацыі"[57]. Прыведзеныя вышэй дадзеныя дазваляюць меркаваць, што ў міжваеннай Заходняй Беларусі беларускі рух дасягнуў сваёй масавасці без умяшання адміністрацыйных органаў, арганічна спалучаючы ў сабе традыцыі беларускай актыўнасці з пачатку XX ст.

---

[1] Гл. падр.: Горны А. Да пытання аб класіфікацыі беларускіх палітычных арганізацый у Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд // Беларускі гістарычны часопіс. 2019. № 9. С. 3—8.

[2] Вашкевіч А.Ф. Лакальныя структуры Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі і Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры (1926—1936 гг.) // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. 2008. № 3. С. 37.

[3] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 242п, воп. 1, спр. 266, арк. 13 адв.

[4] Базарэвіч Г.Х. Беларускі культурна-асветніцкі рух на Браслаўшчыне ў 1925—1930 гг. (па матэрыялах друку Беларускага сялянскага саюза) // Браслаўскія чытанні. Мінск, 2016. С. 214.

[5] Protokoły i raporty zebrań wojewodów i starostów — województwo wileńskie. Białystok-Kraków, 2016. S. 42.

[6] НАРБ. Ф. 242п, воп. 1, спр. 27, арк. 55, 75.

[7] Горны А.С. Беларускія паланафільскія арганізацыі ў грамадска-палітычным і культурным жыцці Заходняй Беларусі (1921—1937 гг.): дыс. … канд. гіст. навук. Мінск, 2015. С. 46.

[8] Сэкрэтарыяты Беларускага Пасольскага Клюбу // Новае жыцьцё. 1923. № 10. С. 4; Палуян У. Беларуская сялянска-рабочая грамада. Мінск, 1967. С. 88; Мятла П. Аб Таварыстве беларускай школы і яго барацьбе. Менск, 1932. С. 23; Горны А.С. Беларускія паланафільскія арганізацыі ў грамадска-палітычным і культурным жыцці Заходняй Беларусі (1921—1937 гг.). С. 45, 54, 71, 167; Разуванава К.С. Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры ў Заходняй Беларусі (1926—1936 гг.). Мінск, 2013. С. 232—234; Даніловіч В.В. Дзейнасць арганізацыі "Змаганне" ў Заходняй Беларусі (1927—1930 гг.). Мінск, 2007. С. 38; Беларускі Гаспадарскі Зьвяз пашыраецца // Народ. 1928. № 4. С. 2.

[9] Тут і далей дадзеныя па гуртках БСРГ прыведзены на 1 снежня 1926 г.

[10] Тут і далей дадзеныя па гуртках ТБШ прыведзены на 1 ліпеня 1927 г.

[11] У дадзеную лічбу ўваходзяць гурткі Беларускага гаспадарчага звязу.

[12] У дадзеную лічбу ўваходзяць гурткі Беларускага гаспадарчага звязу.

[13] У дадзеную лічбу ўваходзіць гурток Таварыства беларускай асветы ў Вільні.

[14] У дадзеную лічбу ўваходзяць гурток Беларускай радыкальнай народнай партыі ў в. Ізабелін Дзісенскага павета.

[15] У дадзеную лічбу ўваходзяць гурткі Беларускага гаспадарчага звязу.

[16] Jaguś J. Ludność białoruska województwa nowogródzkiego II Rzeczypospolitej w percepcji polskich elit regionu. Toruń, 2014. S. 32.

[17] Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГВ). Ф. 200, воп. 1, спр. 17, арк. 416.

[18] Больш падрабязна гл.: Горны А.С. Гарады як лакальныя цэнтры беларускага нацыянальнага руху ў міжваеннай Заходняй Беларусі // Гісторыя і грамадазнаўства. 2020. № 5. С. 14.

[19] Jaguś J. Ludność białoruska województwa nowogródzkiego II Rzeczypospolitej w percepcji polskich elit regionu. S. 55.

[20] Kontrolować czy likwidować — Komunistyczna Partia Zachodniej Białorusi. Białystok-Kraków, 2015. S. 170, 343; Мятла П. Аб Таварыстве беларускай школы і яго барацьбе. С. 24.

[21] Mniejszości narodowe w wyborach do Sejmu i Senatu w r. 1928. Warszawa, 1928. S. 284, 289.

[22] Кароткі нарыс беларускага пытаньня. Мінск, 2009. С. 287.

[23] Горны А.С. Беларускія паланафільскія арганізацыі ў грамадска-палітычным і культурным жыцці Заходняй Беларусі (1921—1937 гг.). С. 45, 167—168.

[24] Сэкрэтарыяты Беларускага Пасольскага Клюбу // Новае жыццё. 1923. № 10. С. 4; Палуян У. Беларуская сялянска-рабочая грамада. С. 88; Мятла П. Аб Таварystве беларускай школы і яго барацьбе. С. 23; Горны А.С. Беларускія паланафільскія арганізацыі ў грамадска-палітычным і культурным жыцці Заходняй Беларусі (1921—1937 гг.). С. 45, 54, 71, 167; Разуванава К.С. Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры ў Заходняй Беларусі (1926—1936 гг.). С. 234—235; Даніловіч В.В. Дзейнасць арганізацыі "Змаганне" ў Заходняй Беларусі (1927—1930 гг.). С. 38; Беларускі Гаспадарскі Зьвяз пашыраецца // Народ. 1928. № 4. С. 2; Беларускі Гаспадарскі Зьвяз. Новыя таварыствы // Народ. 1928. № 16. С. 3.

[25] У дадзеную лічбу уваходзіць гурток Цэнтральнага камітэта па беларускіх справах у Баранавічах і гурток Беларускай радыкальнай народнай партыі ў Баранавічах.

[26] У дадзеную лічбу ўваходзяць гурткі Беларускага гаспадарчага звязу.

[27] У дадзеную лічбу ўваходзяць гурткі Беларускага гаспадарчага звязу.

[28] У дадзеную лічбу ўваходзяць два гурткі Беларускай радыкальнай народнай партыі.

[29] Маецца на ўвазе Беларускае дабрачыннае таварыства, якое дзейнічала ў Стаўбцоўскім павеце ў 1930-я гг.

[30] Горны А.С. Гарады як лакальныя цэнтры беларускага нацыянальнага руху ў міжваеннай Заходняй Беларусі. С. 13—14.

[31] Historia białorusinów Podlasia. Białystok, 2016. S. 268—269.

[32] Разуванава К.С. Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры ў Заходняй Беларусі (1926—1936 гг.). С. 231.

[33] Lietuvos centrinis valstybės archyvas (LCVA). F. 361, ap. 2, b. 7, l. 11.

[34] НАРБ. Ф. 242п, воп. 1, спр. 266, арк. 43.

[35] Палуян У. Беларуская сялянска-рабочая грамада. С. 88.

[36] Чарнякевіч А.М. Нараджэнне беларускай Гародні: з гісторыі нацыянальнага руху 1909—1939 гг. Мінск, 2015. С. 63.

[37] Сэкрэтарыяты Беларускага Пасольскага Клюбу // Новае жыццё. 1923. № 10. С. 4; Палуян У. Беларуская сялянска-рабочая грамада. С. 88; Мятла П. Аб Таварыстве беларускай школы і яго барацьбе. С. 23; Горны А.С. Беларускія паланафільскія арганізацыі ў грамадска-палітычным і культурным жыцці Заходняй Беларусі (1921—1937 гг.). С. 167; Разуванава К.С. Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры ў Заходняй Беларусі (1926—1936 гг.). С. 231—232; Даніловіч В.В. Дзейнасць арганізацыі "Змаганне" ў Заходняй Беларусі (1927—1930 гг.). С. 38; Чарнякевіч А.М. Нараджэнне беларускай Гародні: з гісторыі нацыянальнага руху 1909—1939 гг. С. 82; Horny A., Fionik D. Z dziejów Białoruskiej Włościańsko-Robotniczej Hromady w powiecie Bielskim // Бельскі Гостінэць: культурна-краязнаўчы зборнік. 2020. № 1. С. 155—180.

[38] У табліцу не ўключаны Ломжынскі, Астралэнцкі, Астроўскі, Сувальскі, Высокамазавецкі паветы Беластоцкага ваяводства, дзе пражывала нязначная колькасць беларусаў.

[39] У дадзеную лічбу ўваходзяць структуры Арганізацыі беларускіх беспартыйных актывістаў, Цэнтральнага камітэта па беларускіх справах, Беларускай радыкальнай народнай партыі, Беларускага дабрачыннага таварыства, беларускага таварыства "Еднасць", якія дзейнічалі ў Гродна ў 1920-я гг.

[40] Śleszyński W. Województwo Poleskie. Kraków, 2014. S. 82.

[41] Пашкевіч А. Нацыянальныя працэсы ў Палескім ваяводстве ў 1920-я гг. праз прызму вынікаў выбарчых кампаній у польскі парламент // Arche. 2013. № 4. С. 108.

[42] Там жа. С. 117.

[43] Сэкрэтарыяты Беларускага Пасольскага Клюбу. С. 4.

[44] LCVA. F. 375, ap. 1, b. 74, l. 9.

[45] Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). Ф. 67, воп. 1, спр. 946, арк. 131.

[46] Polesie w polityce rządów II Rzeczypospolitej. Białystok-Kraków, 2009. S. 68, 75, 83.

[47] Брест в 1919—1939 гг.: документы и материалы. Брест, 2009. С. 112—115.

[48] Прыкладам можа быць газета "Родны край" — друкаваны орган т. зв. "беларускай санацыі". Гл. напр.: Адамковіч А. Беларусы ў Літве: учора і сёння. Кніга І. Вільня, 2010. С. 84.

[49] Мазько Э. Палессе ў канцэпцыях беларускіх палітычных партый Заходняй Беларусі. Рэжым доступу: http://мова.бел/movy_svietu/Lang_Eu_As_Af/Indoeuropean/Westpalesian/mazko.htm

[50] Пашкевіч А. Нацыянальныя працэсы ў Палескім ваяводстве ў 1920-я гг. праз прызму вынікаў выбарчых кампаній у польскі парламент. С. 197.

[51] Вабішчэвіч А.М. Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921—1939 гг.). Брэст, 2008. С. 39.

[52] Разуванава К.С. Дзейнасць Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры на тэрыторыі Палескага ваяводства (1926—1936 гг.) // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. Серыя 2. Гісторыя. Эканоміка. Права. 2010. № 1. С. 75.

[53] Брест в 1919—1939 гг.: документы и материалы. С. 105.

[54] Годы испытаний и мужества. Минск, 1973. С. 41, 63.

[55] Сэкрэтарыяты Беларускага Пасольскага Клюбу // Новае жыццё. 1923. № 10. С. 4; Палуян У. Беларуская сялянска-рабочая грамада. С. 88; Мятла П. Аб Таварыстве беларускай школы і яго барацьбе. С. 23; Разуванава К.С. Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры ў Заходняй Беларусі (1926—1936 гг.). С. 235—236; Даніловіч В.В. Дзейнасць арганізацыі "Змаганне" ў Заходняй Беларусі (1927—1930 гг.). С. 38; Cichoracki P. Województwo poleskie 1921—1939. Z dziejów politycznych. Łomianki, 2014. S. 212—213.

[56] У табліцу не ўключаны Камень-Кашырскі і Сарненскі паветы Палескага ваяводства, дзе пражывала нязначная колькасць беларусаў.

[57] Hroch M. Mały narody Europy: Perspektywa historyczna. Wrocław, 2003. S. 40.